**Кансультацыя для бацькоў “Роля сям’і ў развіцці маральных якасцей падлетка” адчыніла дзверы сямейнага клуба “Сонечны круг” у новым навучальным годзе.**

**У шалёным рытме нашага жыцця мы часта забываемся пра самае галоўнае – пра дзяцей, іх выхаванне, іх развіццё. Калі дзіця адчувае ўвагу да сябе, клопат, калі яно абаронена, тады яно накіроўвае свае сілы на развіццё і спазнанне навакольнага свету.**

**Сям’я – гэта свет, у якім закладваюцца асновы маралі, адносін да людзей. Асабліва атуальна гэта ў наш час, калі гэтаму сацыяльнаму інстытуту імкнуцца навязаць нетрадыцыйны кірунак, які скажае сямейныя функцыі, адна з якіх – развіццё маральных якасцей падлетка.**

